# ДЫНАМІКА ТВОРЧЫХ ПРЫЁМАЎ ГАЗЕТЫ «МІНСКАЯ ПРАЎДА» ВА ЎМОВАХ РЭАГАВАННЯ НА РЫЗЫКІ І ВЫКЛІКІ СУЧАСНАСЦІ

***С. К. Берднік***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220141, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*berdniksiarhej@gmail.com*

Вывучэнне кампазіцыйных і моўных асаблівасцей арганізацыі медыятэксту дазваляе прасачыць, якія напрамкі дзейнасці лічыць рэдакцыя найбольш актуальнымі на сучасным этапе. Супрацоўнікі выдання імкнуцца рэагаваць на асноўныя моманты шырокага кола падзей у кожным нумары, пачынаючы з рэспубліканскіх і заканчваючы вузкарэгіянальнымі навінамі. Выкарыстанне абедзвюх дзяржаўных моў магло б быць у выданні больш лагічным і паслядоўным. Матэрыял можа быць выкарыстаны журналістамі пры вывучэнні мовы СМІ.

***Ключавыя словы:*** газета; артыкул; рубрыка; білінгвізм; старонка.

# DYNAMICS OF CREATIVE TECHNIQUES OF THE NEWSPAPER «MINSK PRAVDA» IN RESPONSE TO THE RISKS AND CHALLENGES OF OUR TIME

***S. K. Berdnik***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: S. K. Berdnik (berdniksiarhej@gmail.com)*

The study of compositional and linguistic features of media text organization allows us to trace which areas of activity the editors consider the most relevant at the current stage. The newspaper staff responds to the most important events in each issue, from nationwide to purely regional news. The use of both official languages in the newspaper should be more logical and consistent. The material can be used by journalists when studing the media language.

***Key words:*** newspaper; article; section; bilingualism; page.

Цэнтральная газета цэнтральнага рэгіёна, а менавіта так сябе яшчэ нядаўна пазіцыянавала чытачам «Мінская праўда», выходзіць два разы

на тыдзень – па аўторках і пятніцах. Выданне распаўсюджваецца як у друкаваным, так і ў электронным вырыянце. Сёння можна аформіць электронную падпіску на газету, азнаёміцца з яе PDF-архівам і скачаць любы з нумароў. Тыя матэрыялы, якія мы сустракаем на сайце mpravda.by, у большай ступені маюць інфармацыйна-аналітычны характар і не заўсёды ў поўнай меры адлюстроўваюць друкаваны варыянт выдання.

Гэта ўжо не першы наш артыкул, прысвечаны названай газеце. У папярэдніх матэрыялах былі выказаны пажаданні на адрас калектыву рэдакцыі, якія не былі пакуль што ўлічаны. Па-першае, звярталася ўвага на неабходнасць пашырыць колькасць беларускамоўных матэрыялаў газеты, надаць ёй нацыянальны каларыт. На жаль, толькі рубрыкі сёння ў газеце беларускамоўныя ды на апошняй старонцы гараскоп на тыдзень. Трэба нагадаць, што абласная газета Міншчыны заснавана 1 лістапада 1950 года як беларускамоўнае выданне, хоць мы сёння і выкарысоўваем актыўна абедзве дзяржаўныя мовы. Па-другое, нягледзячы на высокую інфармаванасць сучаснага грамадства, такой аўтарытэтнай газеце не пашкодзіла б мець асобную рубрыку грунтоўных міжнародных навін.

Што да дынамікі творчых прыёмаў на сучасным этапе ў абласной газеце «Мінская праўда», то варта адзначыць наступныя моманты, якія пэўным чынам паўплывалі на яе змест, моўнае напаўненне і нават афармленне. Былі прааналізаваныя тры пятнічныя нумары за 16, 23, 30 красавіка бягучага года. На першай старонцы кожнага з іх – карыкатура ў нумар. Пры гэтым адразу кідаецца ў вочы завостраная палітызаванасць выдання, асабліва на пачатковых 3-5 старонках. Яна праяўляецца перш за ўсё ў загалоўках і падзагалоўках на першых старонках, а таксама ў лексіцы і фразеалогіі асобных артыкулаў, у іх зніжанай стылёвай афарбоўцы. Так, у нумары за 16 красавіка вонкавую карыкатуру суправаджае загаловак «НАТОцисты» з падзагалоўкам «Украина готовится к обострению». Далей – больш цікавыя анатацыі да апублікаваных матэрыялаў у нумары: «Соседей не выбирают, но в морду, если надо, бьют»; «Хайпуем! Сегодня мы с тобой хайпуем!»; «Поле боя – СМИ» і іншыя. Наогул у адзначаных нумарах выкарыстанне слэнгу не адзінкавае. Так, у нумары за 30 красавіка ізноў паўтараецца слова хайп «Дешёвый хайп в красно-белых тонах?», а некаторыя падзагалоўкі ў анатацыях на першых старонках гучаць не зусім адназначна і нават насцярожваюць: «Спишут ли Меркель в утиль?»; «Беларусь – полигон для холодной войны?»; «Призрак Белого дома»; «Апокалипсис, который нам готовили» і некаторыя іншыя. Дарэчы, што датычыць апакаліпсісу, то на чацвёртай старонцы ў раздзеле «Палітыка» яму прысвечаны ар-

тыкул «Белорусский блэкаут. Паника, смерти и многомилионные убытки». У ім размова ідзе пра плануемую дыверсантамі блакіроўку ўсёй энергасістэмы Беларусі.

Зразумела, што газета, дакладней яе рэдакцыя, перабудавалася не з нейкіх асабістых меркаванняў, а ў адпаведнасці з той складанасцю моманту і геапалітычнай абстаноўкай, якія склаліся ў свеце і асабліва вакол нашай краіны. І, канечне, журналісты-патрыёты не могуць і не хочуць хавацца ў кусты, а вастрынёй свайго пяра быць на пярэднім краі змагання за сваю краіну.

Большасць грамадска-палітытычных публікацый мае завострана саркастычную канатацыю. Працытуем  для прыкладу з артыкула Вадзіма Ялфімава «Адфудболілі футбол», змешчаным у рубрыцы «Мир в фокусе», наступныя выказванні: «Но в том-то и дело, что, как и всякая “мафия мафий”, суперлига предполагала сброс с телеги ненужной бабы в виде футбольных середняков и всяких национальных лиг. Короче, “баба” слазить не захотела, упёрлась руками и ногами, и подняла гвалт. И тем привлекла внимание национальных правительств: “Караул, грабют!”».

В результате европейские правительства топнули ножками, «грабить» не дали, элитные клубы сказали «Тпру» – и футбольная телега остановилась.

Ва ўмовах рэагавання на рызыкі і выклікі сучаснасці газета «Мінская праўда» ў грамадска-палітычных рубрыках выкарыстоўвае лексіку і фразеалогію, раней не ўласцівую ёй альбо ўласцівую ў значна меншай ступені. Возьмем для прыкладу асобныя вытрымкі з гутаркі «Идет холодная война без правил» з загадчыкам аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН Мікалаем Шчокіным. Нават без асобных каментарыяў можна прывесці шэраг слоў і выразаў, якія сведчаць пра пэўныя зрухі ў дынаміцы творчых прыёмаў і падыходаў рэдакцыі ў адказ на рызыкі і выклікі сучаснасці: «Мы стали свидетелями шантажа, двойных стандартов, недобросовестной конкуренции; цель одна: сделать из нашей страны очередную “демократическую” трансгенную колонию; целенаправленная дезинформация; это геополитическое противостояние  Запада и Востока; коррупция на всех уровнях власти, национализм, правовой беспредел, фашиствующие банды и экстремистские группировки (об Украине); беглые оппозиционеры, пятая колонна, пособники терроризма; провокации; план мятежа» і некаторыя іншыя.

Ці апраўданы такі стыль у гэтым сур’ёзным выданні? Думаецца, што так, бо чытачу куды больш цікава атрымліваць не бяззубую «сухую» інфармацыю, а звесткі, якія прымушаюць разважаць і рабіць пэўныя высновы.